вопросам, приём посетителей. С учащимися, относящимися к категории детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей, по разрешению социальных проблем постоянно ведут индивидуальную работу педагог-психолог и социальный педагог.

Одним из наиболее важных направлений по формированию гражданской позиции является *развитие массового спорта*, пропаганда здорового образа жизни. Сборные команды Лицея показывают высокие результаты в соревнованиях круглогодичной Спартакиады МЧС, соревнованиях республиканского, областного и городского масштабов. Многие выпускники Лицея имеют отличную физическую подготовленность и являются спортсменами-разрядниками. Спортивная база Лицея используется для подготовки спортсменов области и республики и для проведения соревнований.

Важным направлением деятельности является *профессиональное воспитание* работников и лицеистов. В 2014 году на территории Лицея открылся центр безопасности – первый обучающий комплекс «Центр безопасности», созданный в рамках Государственной программы инновационного развития Республики Беларусь на 2011-2015 годы на базе лицея с целью системной реализации задач профессиональной ориентации. Целевая аудитория центра – дети младшего и среднего школьного возраста, в основу методологии обучения положено виртуальное погружение обучаемых в среду, имитирующую ЧС, и углубленное изучение материала за счет эмоционального восприятия моделируемой обстановки. В Лицее проводится большая профориентационная работа: работники и лицеисты – частые гости дошкольных и общеобразовательных учреждений Республики Беларусь. Традиционно в Лицее проводится день открытых дверей.

Таким образом, Лицей МЧС – платформа для формирования у выпускников гражданской позиции, что в дальнейшем даст возможность успешного обучения в вузах, трудоустройства и адаптации молодого специалиста к работе в органах и подразделениях по чрезвычайным ситуациям и службе в Вооружённых силах Республики Беларусь.

***УДК 37.091.3:130.2:378.4(476.2-21)***

***А. А. Кастрыца, В. С. Новак***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

## АБ ВЫКЛАДАННІ КУЛЬТУРАЛОГІІ Ў ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

Адукацыйны працэс – гэта найперш стварэнне ўмоў для інтэлектуальнага, духоўнага развіцця і асобаснага росту студэнтаў, станаўлення іх як прафесіяналаў, якія будуць максімальна рэалізоўвацца ў разнастайных відах дзейнасці, запатрабаваных высокім узроўнем развіцця грамадства. Менавіта таму ініцыятыўнасць і здольнасць мысліць нешаблонна, адкрытасць і гатоўнасць да набыцця новых ведаў, кампетэнцый шляхам асобаснай уключанасці ў працэс навучання, схільнасць да нестандартнага асэнсавання праблем, самастойнасць у прыняцці рашэнняў павінны быць прыярытэтнымі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў.

Важнае месца ў сацыягуманітарнай адукацыі сучаснага навучэнца займае культуралогія, якая чытаецца для студэнтаў розных спецыяльнасцей і «ўносіць істотны ўклад у фарміраванне міжкультурнай талерантнасці, патрыятызму, каштоўнасных адносін да сусветных і нацыянальных культурных традыцый, спрыяе паспяховай інкультурацыі і сацыялізацыі асобы» [1]. Шырокі выбар розных метадаў, прыёмаў і форм навучання дазваляе выкладчыкам фарміраваць неабходныя кампетэнцыі студэнтаў – будучых спецыялістаў у розных прафесійных галінах.

Вядома, што многія сучасныя адукацыйныя тэхналогіі звязаны з прымяненнем інтэрактыўных метадаў, прыёмаў і форм навучання, напрыклад, такіх, як метад праблемнага

выкладання, метад праектаў, інтэрактыўная лекцыя, кластар, мазгавы штурм, ланцужок асацыяцый, перакрыжаваная дыскусія, дзелавая гульня, мультымедыйныя прэзентацыі, падкасты і відэакантэнт і да т.п. Звернемся да тых, якія на занятках па культуралогіі запатрабаваны намі найбольш:

– *Ланцужок асацыяцый.* Студэнтам прапануецца падабраць сваеасацыяцыі (яны могуць мець рознае ўвасабленне: слова, слова-сімвал, словазлучэнне, малюнак, колер-сімвал і да т.п.) да пэўнага паняцця (напрыклад, *эпоха Сярэднявечча*) і зафіксаваць іх у сшытках, пасля зачытаць услых / праілюстраваць і, калі ёсць неабходнасць, растлумачыць, чым выклікана тая ці іншая асацыяцыя (напрыклад, *хрысціянства, готыка, сабор, замак, рыцарства, універсітэты, інквізіцыя, іперсанальнасць, дыдактызм мыслення).* Пры жаданні асацыяцыятыўныя ланцужкі можна дапоўніць тымі, што ўзніклі ў аднагрупнікаў. Пасля робіцца выбар: у кожным радзе асацыяцый падкрэсліваецца найбольш значнае, на думку чалавека, які робіць гэты выбар, паняцце. Падобная праца з асацыяцыямі дапамагае ўзнаўляць у розных формах веды, якія ўжо былі назапашаны папярэдне, а пасля дадаваць да іх новую для студэнтаў інфармацыю і творча яе перапрацоўваць. Па словах доктара педагагічных навук А.І. Савянкова, «кожная новая інфармацыя, ператварыўшыся ў асабісты набытак чалавека – веды, поўнасцю іх рэканструюе, робіць зусім іншымі. Менавіта таму творчы чалавек – чалавек, адкрыты да новага вопыту, здольны засвойваць новыя веды» [3, с. 60].

– *Правільныя і няправільныя сцверджанні.* Выкладчык прапануе студэнтам на пачатку заняткаў некалькі сцверджанняў і просіць навучэнцаў вызначыць, якія тэзісы з’яўляюцца правільнымі, а якія – памылковымі (пры гэтым абгрунтаванне выбараў з’яўляецца абавязковым). Напрыклад: *1) для Адраджэння характэрна неймавернае развіццё гандлёвых адносін паміж рознымі краінамі; 2) паўночнае Адраджэнне папярэднічала італьянскаму; 3) важнейшай асаблівасцю Адоаджэння з’яўляецца гуманізм; 4) Ян Ван Эйк – яскравы прадстаўнік італьянскага Адраджэння; 5) прадстаўнікамі італьянскай літаратуры эпохі Рэнесансу з'яўляюцца Франчэска Петрарка і Джавані Бакача.* Пасля гэтага выкладчык дае магчымасць выступіць студэнту-апаненту, які прапаноўвае аднагрупнікам максімальна поўную інфармацыю па вывучаемай праблеме, і зноў звяртаецца да студэнтаў з просьбай зрабіць правільныя выбары з шэрагу прапанаваных выказванняў. Відавочна, што такім чынам дасягаецца максімальная ўвага з боку студэнтаў да тэматычнага матэрыялу і высокая ступень запамінання прапанаванай інфармацыі. Гэты метад можа быць запатрабаваны як на практычных, так і на лекцыйных занятках, калі апошнія носяць ітэрактыўны характар.

– *Стварэнне ўласнай тэорыі, стварэнне сімвалаў.* Студэнтам (пажадана работа ў мікрагрупах) прапануецца стварыць уласную тэорыю паходжання мастацтва альбо сімвалы форм культуры, культурных эпох і інш. Атрыманыя вынікі абавязкова афішыруюцца (дыскусія, публічная абарона і да т.п.). Пры выкананні падобных заданняў дзейнасць студэнтаў носіць як творчы, так і пошукавы характар, што, безумоўна, спрыяе развіццю ў іх даследчых кампетэнцый. Акрамя гэтага, адбываецца «самаразвіццё пры дапамозе інтэлектуальнага ўздзеяння, якое абуджае здольнасці да рэфлексіі, мэтаўтварэння, выбару адэкватных рашэнняў, уменняў выбудоўваць з частак цэлае» [2, с. 15].

– *Стварэнне тэматычных відэаролікаў, камп’ютарных гульняў, буктрэйлераў* (напрыклад, «Музеі свету», «Прыгоды сярэдневяковага рыцара», «Таямніцы егіпецкіх пірамід», «Субкультуры майго часу» і інш.). Заданні (яны таксама выконваюцца ў мікрагрупах) носяць адначасова і крэатыўны, і кагнітыўны характар, прапануюцца пры арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, паколькі займаюць шмат часу для падрыхтоўкі. Несумненным станоўчым момантам выкарыстання метаду праектаў з’яўляецца таксама і ўзмацненне адказнасці кожнага студэнта за індывідуальна падрыхтаваную работу, паколькі ён, «працуючы індывідуальна або ў мікрагрупах, павінен прадставіць усёй групе вынікі сваёй дзейнасці» [2, с. 40]. Вынікі гэтых творчых праектаў афішыруюцца не толькі падчас

аўдыторных заняткаў, але і на старонках сацыяльных сетак, што, безумоўна, узмацняе матывацыю студэнтаў.

– *Падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый.* Праграму, у якой выконваюцца падобныя прэзентацыі (MicrosoftPowerPoint, Canva), студэнты выбіраюць самі, у залежнасці ад матэрыялу і ступені валодання камп'ютарам. Публічнае прадстаўленне прэзентацый («Культурныя індустрыі і кіраванне культурай», «Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці ХХ – ХХІ стст.», «Культура Індыі», «Культура XVII–XVIII стст.», «Масавая і элітарная культура», «Гісторыя раманскай архітэктуры», «Што падарыў свету Кітай?» і інш.) адбываецца на семінарскіх занятках рознымі шляхамі: у выглядзе дыялогу з аўдыторыяй, канферэнцыі, круглага стала. Заданні, звязаныя са стварэннем і афішыраваннем прэзентацый, буктрэйлераў, тэматычных відэаролікаў, камп'ютарных гульняў вельмі каштоўныя, паколькі, дзякуючы ім, пашыраюцца магчымасці прадстаўлення вучэбнай інфармацыі, канцэнтруецца ўвага, актывізуецца пазнаваўчая дзейнасць студэнтаў і адбываецца арыентацыя іх на творчы падыход да навучання, ствараецца аснова для рэалізацыі патэнцыяльных магчымасцей у розных галінах ведаў, для выхавання эмацыянальна-каштоўнасных адносін да культуры.

Відавочна, што захаванне прынцыпу свабоднага выбару, арыентацыя на індывідуалізацыю вучэбнага працэсу, павелічэнне хуткасці і якасці засваення вучэбнага маэрыялу, пошук розных шляхоў атрымання неабходнай інфармацыі, пашырэнне відаў вучэбнай дзейнасці, практычная скіраванасць праведзеных студэнтамі даследаванняў з'яўляюцца прынцыповымі для сучасных заняткаў па культуралогіі.

## Літаратура


1. Культурология : типовая учебная программа по учебной дисциплине для учреждений высшего образования [Электронный ресурс]. – URL: pr_kulturologiya_170522.pdf (edustandart.by). – Дата доступа: 08.01.2023.
2. Лакоценина, Т. П. Современный урок. Ч. 5 : научно-практическое пособие / Т. П. Лакоценина, Е. Е.Алимова, Л. М.Оганезова. – Ростов-на-Дону : Учитель, 2007. – 208 с.
3. Савенков, А. И. Содержание и организация исследовательского обучения школьников / А. И. Савенков. – М. : Сентябрь, 2003. – 204 с.


***УДК 37.018.46:378.046.4(476.2)***

***А. В. Клименко, Л. Г. Белка***
*г. Гомель, ГГУ имени Ф. Скорины*

# ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ ПОВЫШЕНИЯ КВАЛИФИКАЦИИ В ИНСТИТУТЕ ДОПОЛНИТЕЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

В настоящее время персонал организации, предприятия, учреждения (далее – организация) является ключевым фактором, определяющим эффективность использования ресурсов. Поэтому обучение является важной составляющей системы управления: готовит персонал к правильному решению задач, обеспечивает в работе высокий уровень эффективности, способствует обеспечению конкурентоспособности, позволяет повышать уровень знаний работников, вырабатывает требуемые профессиональные навыки, формирует систему ценностей и установок, соответствующую сегодняшним реалиям и поддерживающую рыночную организационную стратегию.

Знания, полученные специалистами в учреждениях высшего образования, со временем устаревают. А это, в свою очередь, влияет на успешное выполнение поставленных задач, приводит к неэффективной работе, снижает удовлетворенность работой. Уровень